**МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ**
**РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

вул. Калектарная, 10, 220004, г. Мінск
Тэл./факс: 200-86-87, 200-97-55
E-mail: kanc@minjust.by, minjust@mailgov.by

**МИНИСТЕРСТВО ЮСТИЦИИ**
**РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

ул. Коллекторная, 10, 220004, г. Минск
Тел./факс: 200-86-87, 200-97-55
E-mail: kanc@minjust.by, minjust@mailgov.by

17.08.2012 № 06-12/292

На №

Прылоўскаму Дз.К.
(для заснавальнікаў
Міжнароднага творчага
грамадскага аб'яднання
"КінаМост")

вул. Чарняхоўскага, д.17, кв.56
225710, г. Пінск,
Брэсцкая вобласць

Аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі
міжнароднага грамадскага аб'яднання

Міністэртвам юстыцыі Рэспублікі Беларусь разгледжаны дакументы адносна дзяржаўнай рэгістрацыі Міжнароднага творчага грамадскага аб'яднання «КінаМост» (далей – МТГА «КінаМост»).

Умовы стварэння і дзейнасці грамадскага аб'яднання, яго арганізацыйных структур, а таксама парадак дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання і разгляду дакументаў, прадстаўляемых для яго дзяржаўнай рэгістрацыі, устаноўлены артыкуламі 8, 13 і 14 Закону Рэспублікі Беларусь «Аб грамадскіх аб'яднаннях».

Часткамі сёмай і восьмай артыкула 8 Закону Рэспублікі Беларусь «Аб грамадскіх аб'яднаннях» устаноўлена, што заснавальнікі грамадскага аб'яднання склікаюць устаноўчы з'езд, або канферэнцыю, або агульны сход, або іншы ўстаноўчы сход, на якім прымаюць рашэнне аб стварэнні грамадскага аб'яднання, зацвярджаюць назву і статут грамадскага аб'яднання і выбіраюць органы грамадскага аб'яднання. Згодна заканадаўству міжнароднае грамадскае аб'яднанне абавязана таксама ствараць свае арганізацыйныя структуры, пад якімі разумеюцца яго структурныя падраздзяленні, якія ствараюцца ў адпаведнасці са статутам гэтага грамадскага аб'яднання па тэрытарыяльным або іншым прынцыпе і дзеючыя на падставе статута таго грамадскага аб'яднання, структурнымі падраздзяленнямі якога яны з'яўляюцца.

Для дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання ў месячны тэрмін з дня правядзення ўстаноўчага з'езда, канферэнцыі, агульнага сходу або іншага ўстаноўчага сходу ў Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, міжнародным грамадскім аб'яднаннем таксама прадстаўляюцца дакументы, якія сведчаць аб стварэнні яго арганізацыйных структур на

тэрыторыі аднаго або некалькіх замежных дзяржаў (пратаколы сходаў або выпіскі з іх, спісы членаў грамадскага аб'яднання, якія знаходзяцца ў гэтых арганізацыйных структурах) (абзац шосты часткі шостай артыкула 13 Закону Рэспублікі Беларусь «Аб грамадскіх аб'яднаннях»).

У ходзе вывучэння дакументаў, прадстаўленых для дзяржаўнай рэгістрацыі МТГА «КінаМост» устаноўлена наступнае.

Рашэнне аб стварэнні МТГА «КінаМост» было прынята на Устаноўчым сходзе 20 чэрвеня 2012 г., на якім прыстутнічалі 17 заснавальнікаў (13 грамадзян Рэспублікі Беларусь і 4 грамадзяніна Расійскай Федэрацыі).

З прадстаўленага пратаколу Устаноўчага сходу МТГА «КінаМост» ад 20 чэрвеня 2012 г. № 1 бачна, што на дадзеным Устаноўчым сходзе заснавальнікамі было разгледжана пытанне аб стварэнні грамадскага аб'яднання. У ходзе дадзенага пытання заснавальнікамі было прынята рашэнне аб стварэнні расійскага і беларускага аддзяленняў міжнароднага грамадскага аб'яднання. Пры гэтым пытанні аб зацвярджэнні назвы і статута грамадскага аб'яднання, а таксама аб членстве заснавальнікаў яшчэ не разглядаліся. Такім чынам, рашэнні аб стварэнні арганізацыйных структур МТГА «КінаМост» прынята не ў адпаведнасці са статутам МТГА «КінаМост».

Дадзеныя абставіны сведчаць аб парушэнні ўмоў стварэння міжнароднага грамадскага аб'яднання, яго арганізацыйных структур, якія вызначаны часткамі семай і восьмай артыкула 8 Закону Рэспублікі Беларусь «Аб грамадскіх аб'яднаннях». Дадзенае парушэнне носіць неадхільны характар.

Устаноўлена таксама, што ў падпункце 1.7 пункта 1 статута МТГА «КінаМост» юрыдычны адрас дадзенага міжнароднага грамадскага аб'яднання ўказан не поўнасцю (адсутнічае нумар памяшкання). Азначанае пацвярджаецца тым, што згодна прадстаўленаму ў рэгіструючы орган гарантыйнаму пісьму Прыватнага унітарнага прадпрыемства па аказанню паслуг «Цэнтр Шпілеўскага» ад 15 чэрвеня 2012 г. № 2-п/2012 для юрыдычнага адрасу МТГА «КінаМост» прадстаўляецца не ўвесь будынак па адрасу: Мінская вобласць, Лагойскі раён, г.п.Плешчаніцы, вул.Леніна, 56, а толькі яго частка (памяшканне плошчай 10,7 кв.м.).

Такім чынам, прадстаўлены для дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання статут МТГА «КінаМост» не адпавядае патрабаванню часткі трэцяй артыкула 9 Закону Рэспублікі Беларусь «Аб грамадскіх аб'яднаннях».

На падставе выкладзенага, кіруючыся абзацам трэцім часткі трэцяй артыкула 14 і абзацамі другім і трэцім часткі трэцяй артыкула 15 Закону Рэспублікі Беларусь «Аб грамадскіх аб'яднаннях»,

рашэннем Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 15 жніўня 2012 г. у дзяржаўнай рэгістрацыі МТГА «КінаМост» адмоўлена.

Дадзенае рашэнне можа быць абскарджана ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь на працягу месяца з моманту яго атрымання.

Начальнік ўпраўлення па пытаннях некамерцыйных арганізацый А.О.Кірычэнка

06 Какуша 2006195
17.08.2012 паведамленне аб адмове МТГА «КінаМост»